Учреждение “Зональный государственный архив в г. Молодечно”

# Выдающиеся люди Беларуси

# Таисия Ивановна Трофимова

2026

# Детство



Фотография Т.И. Трофимовой из статьи "Зёлкі ад пакут"
"Наш дзень" от 09.10.1993 г.
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.1.Л.5



**ТАІСА ІВАНАЎНА ТРАФІМАВА (ЯНУЧОК)** нарадзілася на Случчыне ў сям'і настаўніка беларускай мовы і літаратуры. Скончыла Мінскае педвучылішча, Маскоўскі народны універсітэт мастацтваў (тэатральны факультэт), Беларускі Дзяржаўны універсітэт (факультэт журналістыкі).

Член Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь.

Удзельніца творчых семінараў маладых літаратараў Міншчыны ў 1989—1997 гг.

Друкавалася з карэспандэнцыяй, прозай, паэзіяй у мясцовай і рэспубліканскай перыёдыцы, у тым ліку ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", часопісах "Полымя", "Маладосць", "Роднае слова", "Работніца і сялянка", "Першацвет", "Вясёлка", у калектыўным зборніку паэтаў Міншчыны "Нас слова Купалы да творчасці кліча".

Супрацоўнічае з галоўнай рэдакцыяй літаратурна-драматычных праграм Белдзяржтэлерадыё.

Вершы і песні на словы Таісы Трафімавай гучалі на рэспубліканскім радыёвяшчанні, на нацыянальным фестывалі песні і паэзіі ў Маладзечне, на міжнародных фестывалях у Германіі і Турцыі.

Жыве ў Маладзечне. Узначальвае падлеткавае літаб'яднанне "Узлёт" пры гарадскім Цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў.

50

Из биографии Т. И. Трофимовой,
из сборника "Я аб табе спяваю песні"
ЗГА в г. Молодечно Ф 291.Оп.1.Д.13.Л.50

Таисия Ивановна Трофимова (Янучок) родилась 21 января 1955 г. в поселке Маньково Серяжского сельсовета Слуцкого района Минской области.

О своём детстве Таисия Ивановна рассказывает: «Чем дальше уходят детские годы, тем ярче предстают воспоминания. И когда приходится бывать на Случчине – в самом Слуцке, на хуторе Маньково, где я родилась, в деревне Подлипцы, где я прожила пять счастливых годков раннего детства, – меня будто магнитом тянет на встречу с ним – послушать кукушку, мысленно поговорить с аистами...»

# “Узлёт”

1

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

СУСТРЭЧЫ, ПРЭЗЕНТАЦЫІ КНІГ, КОНКУРСЫ, ЗЛЁТЫ, ФЕСТЫВАЛІ

1974, люты – Педагагічнае вучылішча г.Мінск
1988, лістапад – БДУ, факультэт журналістыкі г. Мінск
1989, сакавік – Палац піянераў г.Маладзечна
сакавік – Злёт юных талентаў, прысвечаны 70-годдзю ўтварэнню БССР і КП Беларусі г.Маладзечна
красавік – ПТВ № 87-прыборабудавання г.Маладзечна
жнівень – Рэспубліканскае радыё, сустрэча са слухачамі г.Мінск
снежань – СШ № 7 г.Маладзечна
снежань – Удзел у 1-ым Рэспубліканскім фестывалі маладой літаратуры “ІСЛАЧ-89” п. Іслач
1990, сакавік – Гарадская цэнтральная бібліятэка г.Маладзечна
1991, красавік – СШ № 4 г.Маладзечна
красавік – Злёт юных талентаў г.Маладзечна
май – X абласны злёт “Юныя таленты Міншчыны” г.Мінск
май – Рэспубліканскае радыё, сустрэча са слухачамі г.Мінск
верасень – СШ № 2 г.Маладзечна
снежань – ЦВДіП (Цэнтр эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў) г.Маладзечна
1992, сакавік – Створана літаратурнае аб’яднанне “УЗЛЁТ” пры ЦВДіП г. Маладзечна
жнівень – СШ № 12 г. Маладзечна
верасень – Рэспубліканскае радыё, сустрэча са слухачамі г.Мінск
кастрычнік – Санаторная школа-інтэрнат № 1 г.Маладзечна
1993, студзень – Санаторная школа-інтэрнат № 2 г.Маладзечна
май – Выпуск радыё-газеты літаб’яднання “УЗЛЁТ”
май – Літаратурны семінар на Лагойшчыне в.Акопы
верасень –Літстаронка ў “ Маладзечанскай газеце”пад назвай “У гасцях у “Купалінкі літаб’яднанне “УЗЛЁТ”
верасень – Гарадская цэнтральная бібліятэка г.Маладзечна
кастрычнік – Клуб “Беларуская хатка” г.Маладзечна
**1994, студзень – Прынята ў Саюз беларускіх журналістаў г.Мінск**
люты – СШ № 9 г.Маладзечна
сакавік – Клуб “Равеснік” г.Маладзечна
сакавік – СШ № 11 г.Маладзечна
красавік – Політэхнікум, сустрэча з дэлегацыяй з Украіны г.Маладзечна
май – СШ № 5 г.Маладзечна
чэрвень – Выпуск радыё-газеты літаб’яднання “УЗЛЁТ” г.Маладзечна

Из творческого отчета Т.И. Трофимовой
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.11.Л.1

Таисия Ивановна училась в начальной школе в Подлипцах, потом окончила 8 классов Серяжской средней школы и поступила в Минское педагогическое училище.

Затем окончила театральный факультет Московского народного университета искусств и факультет журналистики Белорусского государственного университета. Работала в Средней школе № 10 г. Слуцка, затем социальным педагогом Молодечненского государственного музыкального училища имени М.К. Огинского, руководителем литературно-музыкальной гостиной «Узлёт» в Молодечно, в Минске – редактором отдела публицистики журнала «Маладосць», администратором в Литературном музее имени Максима Богдановича.




Эмблема литературного объединения “Узлет”
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.6.Л.3


ПАЭЗІЯ — ПТУШКА НЯБЕСНАЯ

Лёгкіх крылаў вам, “узлётаўцы”!

Статья о литературно-музыкальной гостиной “Узлет”,
Молодечненская районная газета “Маладзечанская газета” от 18.11.1998 г.
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.6.Л.6

# Союз журналистов и Союз писателей

Первая статья появилась в Слуцкой районной газете «Шлях Ільіча» в 1970 г. Первое стихотворение было опубликовано в Молодечненской районной газете «Святло камунізму» в 1977 г. В дальнейшем печаталась в местной, региональной и республиканской периодике. С 1994 г. - член Союза журналистов, с 2001 г. - Союза писателей Беларуси. Слуцк, Молодечно и Минск – три города, которые повлияли на ее творческую судьбу.

нікаў. Прыемна таксама, што разам са мною сябрам СБП стала мая сястра Таіса Трафімава. Яна жыве ў Маладзечна, працуе ў часопісе "Куфэрак Віленшчыны" і адначасова сацыяльным педагогам у музычным вучылішчы. Дарэчы, цікавы нюанс: гэта ўпершыню, калі адначасова сябрамі СБП сталі дзве сястры.

О принятии Т..И. Трофимовой в СБП
"Слуцкая панарама" от 10.05. 2001 г.
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.9.Л.2

**Таіса ТРАФІМАВА, супрацоўніца цэнтра эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў:**

— Вялікі дзякуй супрацоўнікам рэдакцыі за разуменне і падтрымку. У 19 год, пасля заканчэння педвучылішча, прыехала я ў Маладзечна і ўвесь час — 25 год — супрацоўнічаю з мясцовай газетай. Друкавала на яе старонках свае абразкі, артыкулы, вершы. Затым закончыла факультэт журналістыкі, і ўсё гэта спрыяла таму, што мяне прынялі ў Саюз журналістаў. Гэта дало мне аўтарскае права, цяпер мне лягчэй "прабівацъ", даваць дарогу ў свет сваім вершам і нават песням. Нядаўна разам са спявачкай Стэлай мы напісалі песню "Каталіся на каруселях". Мяне ўжо запрасілі на Беларускае тэлебачанне, там быў запісаны кліп, які мне вельмі спадабаўся, гэта песня ўвайшла ў залаты фонд беларускай эстрады, а я за яе атрымала мільён...

Друкавалася я ў газеце, друкавалася, а не так даўно выйшла наша з сястрой сумесная кніжка "Усміхнуся вятрам". У выдавецтве "Мастацкая літаратура" рыхтуецца да друку і другая наша кніга, якая носіць назву "Паспелі вішні".

Т. И. Трофимова о своем творческом пути и планах
Молодечненская районная газета "Маладзечанская газета" от 09.01. 1998 г.
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.2.Л.11

## Прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў



**Мазько Андрэй Іванавіч,** 1955 г. н. Аўтар зборніка вершаў "Жыве калодзеж" (Мінск, 1999 г.), друкаваўся ў 2-х калектыўных зборніках паэзіі "Дзядзінец. Паэзія Берасцейшчыны" (Брэст, 1999г.) і "Добрыя словы кажыце" (Брэст, 2000 г.). Працуе начальнікам упраўлення гарадской гаспадаркі райвыканкама г. Іванава.

**Трафімава Таіса Іванаўна,** 1955 г. н. Аўтар паэтычных зборнікаў "Нас слова Купалы да творчасці кліча" (1995, Мінск), "Усміхнуся вятрам" (1998, Мінск), "Як зёлкі ад пакут..." (1998, Маладзечна), "Агледзіны" (1998, Мінск). Некаторыя вершы Таісы Трафімавай пакладзены на музыку.

Працуе сацыяльным педагогам у музычным вучылішчы Маладзечна.

**Таіса Супрановіч** (сапр. Гурко Таіса Іосіфаўна), 1956 г. н. Аўтар кнігі "Мужчыны і жанчыны" (1999, Мінск). Працуе загадчыцай дзіцячай бібліятэкі ў Навагрудку.

**Суднік Станіслаў Вацлававіч,** 1954 г. н. Аўтар паэтычнага зборніка "Мой Грунвальд" (1999, Ліда), кнігі публіцыстыкі "Шыхтовы статут беларускага войска" (1999, Прыазёрск, Казахстан), "Кароткага расейска-беларускага вайсковага слоўніка" (1993, Мінск), "Расейска-беларускага вайсковага слоўніка" (1997,Мінск). Рэдактар газеты "Наша слова" і часопіса "Лідскі летапісец".

**Прохар Маргарыта Пятроўна,** 1979 г. н. Аўтар кнігі прозы "Насустрач сонцу" (2000, Мінск). Студэнтка філалагічнага факультэта БДУ.

**Паліканіна Валянціна Пятроўна,** 1958 г. н. Аўтар зборнікаў паэзіі "Найдите время для любви" (1998, Мінск) і "Две Музы" (2000, Мінск). Працуе спецкарэспандэнтам і аглядальнікам аддзела культуры часопіса "Беларусь".

**Падлінская Зоя Іванаўна,** 1964 г. н. Аўтар зборнікаў паэзіі "Палон нябёсаў" (1998, Мінск), "Нас слова Купалы да творчасці кліча" (1995, Мінск). Працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 10 г. Слуцка.

О принятии Т.И. Трофимовой в члены Союза писателей Республики Беларусь, 2001 г.
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.9.Л.11

*ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ !*

*Запрашаем Вас на XVII Злёт юных талентаў*

*"Нас слова Купалы да творчасці кліча..."*

*Злёт адбудзецца 19 красавіка 2002 г. у бібліятэцы сямейнага чытання "Верасок" (вул. В.Гасцінец д.121) пачатак у 11 гадзін*

11.00 Знаёмства з выставай мастакоў.
11.15 Адкрыццё Злёту юных талентаў. Прывітанне удзельнікаў злёту ад арганізатараў.
11.30 Удзельнікаў злёту вітае тэатральная студыя "Кипяток" пад кіраўніцтвам Стасюлевіч Л.М. (САШМ) Я.Купала "Паўлінка".
12.15 Прадстаўленне журы.
12.20 Уручэнне ўзнагарод пераможцам конкурсу юных паэтаў, выступленне пераможцаў. Прывітанне пераможцам ад члена Саюза журналістаў Рэспублікі Беларусь *Маркелава Валерыя Анатольевіча*
12.40 Уручэнне ўзнагарод пераможцам конкурсу юных празаікаў, выступленне пераможцаў. Прывітанне пераможцам ад члена Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь *Трафімавай Таісіі Іванаўны* і галоўнага рэдактара часопіса "Куфэрак Віленшчыны" *Казлоўскага Міхася Міхасевіча.*
13.00 Уручэнне ўзнагарод пераможцам конкурсу юных мастакоў. Удзельнікаў вітае член Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь *Лазоўскі Васіль Міхайлавіч.*
13.10 Закрыццё Злёту юных талентаў.

О приветствии победителей конкурса юных прозаиков XVII Слета юных талантов "Нас слова Купалы да творчасці кліча..." Т.И. Трофимовой, членом Союза писателей Республики Беларусь, 2002 г.
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.6.Л.111

# Гимны

Таисией Ивановной написано семь произведений гимничного пения, среди них – гимн Молодеченскому району «Земной поклон», региональному фестивалю исполнителей эстрадной песни «Одна земля», областному фестивалю народной музыки «Играй, гармонь», областному фестивалю «Звучат цимбалы на земле Купалы», Молодеченскому музыкальному училищу имени М.К. Огинского (в соавторстве с Р. Сороко), Дворцу культуры г. Молодечно.

21

2 *Molodechno Musical College named after M. K. Oginsky*

ГІМНІЧНЫ СПЕЎ
МАЛАДЗЕЧАНСКАГА МУЗЫЧНАГА ВУЧЫЛІШЧА
імя М. К. АГІНСКАГА
словы Таісы Трафімавай і Рыгора Сарокі,
музыка Алены Атрашкевіч

THE ANTHEM
OF THE MOLODECHNO MUSICAL COLLEGE NAMED AFTER
M. K. OGINSKY
Lyrics by Taisa Trofimova and Grigory Soroka
Music by Yelena Atrashkevich




2. Жыві, наш храм, шчаслівa векі вечныя,
Патрэбным будзь дарослым і малым,
Утульным домам, носьбітам адвечнага,
Заўсёды цёплым, родным і святым.
Прыпеў.

Гимн Молодеченского музыкального колледжа имени М.К. Огинского
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.4.Л.21

1

ПЕСНЯ - ГІМН
МАЛАДЗЕЧАНСКАМУ РАЁНУ
ЗЯМНЫ ПАКЛОН

Словы Т.Трафімавай
Муз. А.Атрашкевіч

Есць мясціна ў Беларусі -
...зіўны край льняных абрусаў,
Шум лясоў і звон крыніц-
Як яго нам не любіць!
Сее песні, сее лён
Маладзечанскі раён.
Прыпеў:
Паэтычны край Купалы,
...рай цудоўных фестываляў...
І пад гуслі тых вякоў
Сустракаем землякоў.
Славіць рукі хлебаробаў
...онца - хлеб вышэйшай пробы!
На духмяны каравай,
Калі ласка, прыязджай!
Незабыўная старонка -
...льюцца песні звонка-звонка,
Ціха плешчыцца Уша -
Маладзее тут душа.
Маладзее з намі ён,
Маладзечанскі раён.
Прыпеў.
Хто працуе тут старанна,
Тым і слава, і пашана.
Прыгажэй няма зямлі!
Вольна кружаць жураўлі...
Шлём табе зямны паклон,
Маладзечанскі раён!
Прыпеў.





Песня-гимн Молодеченскому району "Зямны паклон"
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.3.Л.1

6

## Адна зямля

*Муз. Алены Атрашкевіч*
*Вершы Таісы Трафімавай*




1) Зямля бацькоў, цудоўная зямля.
Пашчасціла і мне тут нарадзіцца.
Да скону дзён, і зблізку, і здаля
Табою, любы край, мне ганарыцца!
*Прыпеў*:
Адна зямля ў нас з табой, адна.
Дае нам сілы чыстая крыніца.
Куды б мяне дарога ні вяла,

2) Мой край рамонкаў, сініх васількоў,
Тут плакаць і смяяцца можна ўволю.
Тут сустракаюць дарагіх сяброў
І песняй звонкаю, і хлебам–соллю!
*Прыпеў*.

*На рэгіянальным фестывалі—конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Адна зямля», што ў ліпені прайшоў у Чысці, песня стала гімнам гэтага свята.*

3

**Песня-гімн**
**абласному фестывалю**
**"Гучаць цымбалы на зямлі Купалы"**

Струны лёсу звіняць,
Быццам струны цымбалаў,
А музыка-пясняр сваю песню люляе –
Сакалінае сэрца і шчодрыя рукі
Рассыпаюць, як промні,
Чароўныя гукі.

Заспявалі цымбалы расчуленым рытмам,
Быццам гуслі Купалы, якіх не забыць нам
Думы сонечных струн гоніць вецер свавольны,
Раскалыхвае хваляй жытнёвае поле.
Працінаюць цымбалы расчуленым рытмам,
Быццам гуслі Купалы, якіх не забыць нам
Будзем Янавым святам вяночкі сплятаці,
Пад звон-песню ў начы кветку шчасця шукаці.

Прыпеў:
Дапяцела яна песняй-думкай крылатай
Да дзяцінства майго, да бацькоўскае хаты.
Разляцелася песня па ўсёй Беларусі,
Да яе, як да маці, душой прыхінуся!

Узыду на курган, як узнімецца Сонца,
Буду слухаць я гуслі-цымбалы бясконца.
Праспявай жа, Музыка, нам песню святую,
Ушануй Беларусь, Беларусь маладую!

Фестываль "Сярэбраны звон цымбалаў" Маладзечна 2002

Песня-гимн областному фестивалю "Гучаць цымбалы на зямлі Купалы"
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.3.Л.3

Песня-гимн региональному фестивалю исполнителей эстрадной песни "Адна зямля"
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.4.Л.6

# Студии

Песни на слова поэтессы исполняют студии детской песни «Буслік», «Песенька» – Минск, образцовый театр песни «Хвілінка» – Минск, эстрадная студия «Наталі» – Минск, а также студии детской песни Молодечно, Гомеля, Столина, Жодино и других городов и регионов. Звучат песни и в исполнении солистов Белгосфилармонии.






**Таиса Трофимова** – поэтесса, член Союза писателей и журналистов Беларуси. Автор сборников стихов «Усміхнуся вятрам», «Зёлкі ад пакут».

Работает социальным педагогом в Молодечненском музыкальном училище им. М.К.Огинского. Совмещает различные направления деятельности: педагогическую, журналистскую, театральную, поэтическую.

Песни на слова поэтессы звучали на международном фестивале искусств «Славянский базар» в Витебске, Национальном фестивале песни и поэзии в Молодечно, а также международных и региональных фестивалях не только в Беларуси, но и в Германии, Турции, Болгарии.

В издательстве «Мастацкая літаратура» подготовлен к изданию сборник стихов Т.Трофимовой «Паспелі вішні», а в издательстве «Беларусь» – сборник детских песен «Лесные истории», написанные в соавторстве с Л.Лещевич и композитором Е.Атрашкевич.

Таиса Трофимова сотрудничает с ведущими белорусскими композиторами. В соавторстве с Е.Атрашкевич написаны фестивальные песни «Адна зямля», «Грай, гармонік», «Струны цымбалаў». Т.Трофимова является замечательным переводчиком многих песенных текстов: «Караблікі», «Чыпаліна», «Туман», «Хлопец з парасонам» и др. В репертуар студии входят и её авторские песни.

Среди первых исполнителей песен на слова Т.Трофимовой – Д.Уризченко, Д.Сергеев, Л.Синкевич, А.Жук, А.Абрамович.

Буклет образцовой эстрадной студии "Спяваем разам"
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.19.Л.26



СУБОТА, 11 ЛІСТАПАДА 2000 ГОДА МГ

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

…нцэртнай зале музычнага вучылішча адбылася прэзентацыя аўдыёкасеты …дка дзяцінства», на якой былі прадстаўлены лепшыя песні кампазітара …ны Атрашкевіч у выкананні юных салістаў эстраднага класа.

…гачаканая ўсімі прыхільнікамі таленту Алены Віктараўны і яе выхаванцаў …ня прайшла ва ўмовах абсалютнага аншлагу. Публіка была шчырай і …драй на апладысменты і кветкі, кампазітар — шчаслівай і крыху разгуб…ай ад маштабаў народнай любві і павагі, а ад прыгажосці і крышталёвай …ціні дзіцячых галасоў проста захоплівала дух.

## НЕПРАВІНЦЫЯЛЬНЫЯ ТАЛЕНТЫ

Фірму «Каўчэг», якая выпусціла касету, прадстаўляў паэт Юрый Цыбін, вядомы яшчэ і сваёй падтрымкай юных талентаў. Ён зазначыў, што сярод 150 праектаў, якімі займалася фірма, «Лодка» — самы лепшы. Па словах Цыбіна, ейн дае права прагназаваць, што хутка не толькі Земфіра або Баскаў будуць пакараць сусветныя прасторы, але і такія вось дзеці» — магчыма, нашы, маладзечанскія...

— Нядаўна, — дадаў ён, — мы з вашым земляком Ігарам Шчолакавым выпусцілі экспе…

…іх і дапамагчы ім раскрыцца. Дзякуй Алене Атрашкевіч, адметнымі рысамі якой з'яўляюцца бескарыслівасць, энтузіязм і любоў да дзяцей, да справы, якой яна служыць...

Цёплыя і сардэчныя словы знайшла для дзяцей і іх настаўнікаў загадчыца гарадскога аддзела культуры Надзея Сідарэнка:

— Кожны з нас у свой час плыве на лодцы дзяцінства. Шчасце, што капітанамі гэтага цудоўнага маленькага экіпажа з'яўляюцца Алена Атрашкевіч і Пётр Туронак. Няхай жа лодачка шчаслівa абміне ўсе рыфы, айсбергі і штормы, каб ператварыцца потым у цудоўны карабель з пунсовымі ветразямі, які даставіць іх да шчасця. І яшчэ адна добрая навіна: сродкі, якія чакала Алена для выдання свайго зборніка, ужо ў гарвыканкаме...

Гэта была не апошняя радасць вечара. Як высветлілася, вясной у Мінску адбудзецца аўтарскі вечар Алены Атрашкевіч. А ў снежні яе выхаванцы стануць удзельнікамі міжнароднага фестывалю ў Санкт-Пецярбур…

…АКІДАЮЧЫ ЗАЛУ пасля заканчэння не…

Іна КАНДАУРАВА.
Фота Андрэя Каскіна.

Статья о II фестивале народной музыки "Грай, гармонік!",
Молодечненская районная газета "Маладзечанская газета" от 06.10. 20
ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.8.Л.22

# Награды

Поэтесса награждена «Золотой медалью» управления культуры Минского облисполкома и обкома профсоюзов работников культуры за победу в областном смотре творческих коллективов (1977), нагрудным знаком Союза писателей Беларуси «За большой вклад в литературу» (2014) и др.



Т.И. Трофимова

Изображение из интернет-источника [Дата обращения: 06.04.2026 г.]

1

**УЗНАГАРОДЫ**

1. "Залаты медаль" Упраўлення культуры Мінскага аблвыканкама і абкама прафсаюза работнікаў культуры за перамогу ў абласным аглядзе творчых калектываў (народны ансамбль песні і танца "Спадчына"), кастрычнік 1977.
2. Дыплом лаўрэата фестывалю мастацкай творчасці, прысвечаны 100-годдзю Я.Купалы і Я.Коласа (Палац культуры чыгуначнікаў г.Маладзечна), сакавік 1982.
3. Дыплом лаўрэата гарадскога конкурсу чытальнікаў "Люблю свой край, старонку гэту", прысвечанага 500-годдзю Ф.Скарыны. Аддзел культуры Маладзечанскага гарвыканкама, сакавік 1990.
4. Прыз сімпатыі гледачоў у аглядзе-конкурсе аўтарскай песні, сакавік 1993. г.Вілейка.
5. III месца ў аглядзе-конкурсе аўтарскай песні "Зорны час", 1994. г.Маладзечна.
6. Дыпламант II Усеўкраінскага фестывалю народнай творчасці «Всі ми діти твої, Україно», лістапад 1995. г.Кіеў.
7. Лаўрэат Маладзечанскай газеты за цыкл новых лірычных вершаў. Грашовая прэмія ад рэдакцыі МГ, студзень 1995.
8. Грашовая прэмія Белдзяржтэлерадыёкампаніі РБ за актыўны ўдзел у фестывалі песні і паэзіі, чэрвень 1996. г. Маладзечна.
9. Ганаровая грамата аддзела культуры гарвыканкама як кіраўніку падлеткавага літаратурнага аб'яднання «Узлёт » за асабісты ўклад у эстэтычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў і вялікую работу па прапагандзе беларускай народнай спадчыны, кастрычнік 1997.
10. Грашовая прэмія Белдзяржтэлерадыёкампаніі РБ за песню-шлягер "Каруселі" (муз. Стэлы, сл.Т.Трафімавай і Стэлы), чэрвень 1998. г. Мінск.
11. Грашовая прэмія і каштоўныя падарункі за аўтарскі вечар Таісы Трафімавай "ШЧАСЛІВАЯ, ШТО КРЫЛЫ МАЮ", ЦБ імя М.Багдановіча, сакавік 1999.
12. Грашовая прэмія за песню-гімн рэгіянальнага фестывалю маладых выканаўцаў эстраднай песні "АДНА ЗЯМЛЯ". Аддзел культуры райвыканкама, ліпень 1999.
13. Грашовая прэмія за песню-гімн Маладзечанскага раёна "Зямны паклон".Аддзел культуры райвыканкама, сакавік 2000.
14. Грашовая прэмія за аўтарскі вечар Таісы Трафімавай "ШЧАСЛІВАЯ, ШТО КРЫЛЫ МАЮ", улікова-планавы тэхнікум, красавік 2000. г.Маладзечна.
15. Дыплом лаўрэата I-га дэканальнага конкурсу каляднай песні, прысвечанага 200-годдзю Хрысціянства ў намінацыі "Лепшая літаратурна-музычная кампазіцыя", снежань 2000.
16. Грашовая прэмія за песню-гімн абласнога фестывалю "ГУЧАЦЬ ЦЫМБАЛЫ НА ЗЯМЛІ КУПАЛЫ", май 2001.
17. Грашовая прэмія да Дня беларускага пісьменства і друку. Рэдакцыя Маладзечанскай газеты, верасень 2001.
18. Грашовая прэмія за песню-гімн II-га абласнога фестывалю народнай музыкі "ГРАЙ, ГАРМОНІК", верасень 2001.
19. Грашовая прэмія за гімнічны спеў Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М К Агінскага, красавік 2002.
20. Дыплом IV Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур за прапаганду нацыянальнага мастацтва Міністэрства культуры РБ . май 2002. г. Гродна.
21. Дыплом абласнога фестывалю аўтарскай песні Упраўлення культуры Мінскага аблвыканкама, чэрвень 2002.
22. Падзяка і каштоўныя падарункі ад аддзела культуры гарвыканкама за аўтарскі вечар "ШЧАСЛІВАЯ, ШТО КРЫЛЫ МАЮ", сакавік 2003. г.Маладзечна.
23. Грашовая прэмія, прымеркаваная да 45-годдзя Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М.К.Агінскага, кастрычнік 2003.

Список наград Т.И. Трофимовой

ЗГА в г. Молодечно Ф.291.Оп.1.Д.10.Л.1




*“…Цудоўны вечар прыўзніму радкамі,*
*Акрыленая ўзнёсласцю хвілін!*
*“Мы расстаёмся ненадоўга з Вамі…”*
*А мне надоўга - светлы ўспамін.”*

*Т.И.Трофимова*